УДК 327.33(476)

**А. А. Райчонак**, кандыдат гістарычных навук, дацэнт (БДТУ)

# ПРАЦЭС УРБАНІЗАЦЫІ БЕЛАРУСІ І ЯГО ЎПЛЫЎ НА ФАРМІРАВАННЕ БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫІ

У дадзенай публікацыі разглядаецца працэс урбанізацыі ў Беларусі і яго ўплыў на заключны этап фарміравання беларускай нацыі ў рэчышчы тэорыі мадэрнізацыі. Робіцца спроба прасачыць ягоныя асноўныя этапы, даць кароткі агляд аналагічных працэсаў у шэразе суседніх рэгіёнаў і параўнаць колькасныя паказчыкі развіцця працэсу ўрбанізацыі ў Беларусі і ў заходнееўрапейскім рэгіёне ўвогуле.

The article is devoted to the process of urbanization in Belarus and its influence on the final stage of the formation of the Byelorussian nation in the tideway of the modernizationrs theory. The attempt to follow up its principal stages, to do the brief survey of identical processes in some neighbouring regions and to compare the quantitative measures of the development of the urbanization process in Belarus and generally in the Eastern Europe region has been done.

**Уводзіны.** Асэнсаванне нацыятворчых працэсаў з'яўляецца адной з прыярытэтных тэм беларускай гістарыяграфіі на працягу ўсяго часу яе існавання. За дзесяцігоддзі плённай працы было назапашана шмат карыснага матэрыялу, але яго асэнсаванне, на жаль, стрымлівалася штучнымі ідэалагічнымі забаронамі. Пасля знікнення манаполіі марксісцкай ідэалогіі на інтэрпрэтацыю гістарычнага развіцця з'явіліся магчымасці для выкарыстання новых метадалагічных падыходаў. Між тым узніклі і новыя праблемы. Як вядома, на сённяшні момант не існуе агульнапрызнанай тэорыі нацый і нацыятварэння. З аднаго боку, гэта дае пэўныя магчымасці для развіцці творчага падыходу ў гістарычным даследаванні, з другога – пагражае скатываннем да метадалагічнай анархіі.

На наш погляд, цікавую метадалогію прапануе так званы мадэрнізацыйны падыход, які дазваляе даволі плённа спалучыць марксісцкі падыход з новымі тэндэнцыямі ў развіцці гістарычнай навукі.

**Асноўная частка.** Распрацоўка праблем узнікнення і развіцця нацый вырашаецца ў рэчышчы тэорыі мадэрнізацый ўжо больш за 50 гадоў і пэўна самым яскравым прадстаўніком дадзенага накірунку з'ўляецца Э. Гелнер [1]. Аднак мы спынімся больш падрабязна на поглядах іншага прадстаўніка гэтага накірунку – К. Дойча. Гэта звязана ў першую чаргу з тым, што ён прапануе колькасныя мадэлі для вырашэння дадзенага пытання. Па яго меркаванні, нацыі – гэта своеасаблівыя згусткі інфармацыі, дзе абмен інфармацыяй унутры значна вышэйшы, чым са знешнімі сістэмамі. Нацыя, з яго пункту гледжання, з'яўляецца прадуктам мадэрнізацыі, г. зн. пераходу ад грамадства традыцыйнага да індустрыяльнага. Ступень актыўнасці нацыі залежыць, на яго думку, ад ступені мабілізацыі ў працэсе нацыятварэння, якую ён прапаноўваў вымяраць зыходзячы з наступных крытэрыяў: 1) колькасць граматных; 2) тыя, хто чытаюць газету раз на тыдзень; 3) занятыя на вытворчасці з колькасцю работнікаў больш за 5 чалавек; 4) колькасць людзей, якія змянілі месца жыхарства пасля нараджэння; 5) колькасць гарадскога насельніцтва ці ступені ўрбанізацыі.

Менавіта апошняму пункту дадзенай мадэлі ўтварэння нацыі і будзе прысвечана далейшае даследаванне.

Гэта звязана з тым, што цікавасць да праблемы развіцця гарадоў заўжды знаходзілася ў цэнтры ўвагі гістарычнай навукі. Гістарычная роля горада вялікая, асабліва ў Еўропе. Менавіта ў еўрапейскім горадзе ствараліся не толькі эканамічныя, прававыя, але і культурна-ідэалагічныя асновы сучаснага жыцця. Горад ствараў стандарт нацыянальнай мовы, прававую мадэль сучасных нацыянальных дзяржаў. Фактычна тут складвалася мадэль сучаснай нацыі. Гарады заўсёды былі і застаюцца своеасаблівымі лабараторыямі па самасцвярджэнні і самавызначэнні нацый. Любая сучасная эканоміка пераважна складаецца з эканомікі гарадоў.

На думку выдатнага французскага гісторыка Фернана Брадэля, гарады – нібыта электрычныя трансфарматары, якія павышаюць напружанне, паскараюць абмен, бесперапынна вяршаць жыццё людзей. Па яго трапным выказванні, якое дазваляе патлумачыць неабходнасць паглыбленага вывучэння дадзенай праблематыкі: «Гарады і грошы з'яўляюцца адначасова і рухавіком, і паказчыкам развіцця, яны выклікаюць змены і паказваюць на іх» [2, с. 21].

З ростам гарадоў цесна звязана ўрбанізацыя. Звычайна пад гэтым тэрмінам разумеюць павелічэнне колькасці гарадскога насельніцтва за кошт вясковага ў выніку росту існых гарадоў і ўзнікнення новых. Аднак у шырокім плане ўрбанізацыя звязваецца з павышэннем грамадскай ролі гарадоў у цэлым. Павялічваецца не толькі колькасць гарадскога насельніцтва.

Гараджане бачна розняцца ад вяскоўцаў не толькі вонкава, але і ўнутрана – ментальнасцю, ці ладам мыслення, узроўнем культуры, новымі традыцыямі

Праблемы ўрбанізацыі прыцягваюць увагу прадстаўнікоў розных галін ведаў – сацыялогіі, філасофіі, гісторыі, культуралогіі, эканомікі, геаграфіі і г. д. Спіс работ айчынных і замежных даследчыкаў, прысвечаных урбанізацыі, налічвае сотні старонак. Даследаванне праблем урбанізацыі забяспечвае раскрыццё многіх важных асаблівасцей, тэндэнцый і сутнасных сэнсаў развіцця грамадства. Галоўныя пошукі ў даследаваннях праблем урбанізацыі звязаныя з вызначэннем сувязей урбанізацыі і горада, урбанізацыі і грамадства, утварэннем новых сацыяльных супольнасцей, у першую чаргу нацый. Шматпланавасць, шматузроўневасць тэмы ўрбанізацыі абумоўліваюць складанасці пры яе даследаванні. Вучоныя многіх краін прапаноўваюць розныя канцэпцыі і падыходы да вывучэння феноменаў урбанізацыі і горада. Даследаванні ўрбанізацыі ахопліваюць розныя яе ўзроўні і аспекты. Найчасцей характарыстыкі і асаблівасці ўрбанізацыі разглядаюцца ў рэгіянальных рамках.

Значнае месца заняла тэматыка, звязаная з гістарычным паходжаннем і фармаваннем старажытных гарадоў, з'яўленне якіх успрымаецца як пачатак станаўлення і развіцця ўрбанізацыі. Асобную сферу даследаванняў складаюць работы, прысвечаныя гісторыі гарадоў як носьбітаў урбаністычных традыцый. Распрацоўваюцца праблемы, звязаныя з асэнсаваннем ролі горада і працэсаў урбанізацыі ў розныя перыяды і ў гістарычнай дынаміцы.

Пашыраюцца даследаванні, у якіх аналізуецца ўздзеянне ўрбанізацыі на развіццё грамадства і распрацоўваецца комплекс сацыяльных і сацыяльна-эканамічных праблем, звязаных з ёю. З'яўляюцца работы, у якіх урбанізацыя разглядаецца як асобная з'ява сацыякультурнага працэсу і фактар сацыяльнай эвалюцыі і г. д. Аднак неабходна падкрэсліць, што пры ўсіх дасягненнях і актыўным разгортванні далейшых даследаванняў праблематыка ўрбанізацыі застаецца яшчэ ў многім нявывучанай [5].

Адно з найбольш складаных пытанняў ва ўрбаністычнай праблематыцы – гэта ўзаемадзеянне нацыі і ўрбанізацыі. Па гэтым пытанні праходзіць размежаванне поглядаў на ўрбанізацыю, яе разуменне. У сучаснай урбаністыцы выдзяляецца накірунак, які арыентаваны на разгляд урбанізацыі як фактару ўплыву горада на развіццё грамадства, распаўсюджання гарадскога ладу жыцця. Гэты накірунак абапіраецца на адпаведную тэарэтычную базу, у ім выкарыстоўваюцца спецыфічныя метады даследавання.

Асобны накірунак утвараюць даследаванні ўрбанізацыі, звязаныя з аналізам асаблівасцей эканомікі, сацыяльных структур, гісторыі гарадоў, характарыстыкі якіх ацэньваюцца як узроўневыя паказчыкі ўрбанізацыі грамадства. Тут назапашаны вялізарны патэнцыял навуковых ведаў і сфармаваліся свае прынцыпы пазнання горада як з'явы ўрбанізацыі. Разам з тым усё больш актуальнай становіцца задача раскрыцця сацыякультурнага адзінства горада і працэсаў урбанізацыі як феноменаў, якія маюць адзіную сутнасць і гістарычную абумоўленасць, і як з'яў, якія не толькі знаходзяцца ў глыбокай узаемазалежнасці, але і не існуюць паасобна ў рэальным быцці. Разуменне гэтага, мэтанакіраванае даследаванне ўзаемадзеяння гарадскіх структур і ўрбанізацыйных працэсаў у іх сутнасным адзінстве можа забяспечыць найбольш поўнае раскрыццё іх гістарычнага значэння ў развіцці грамадства.

Прыгадаем, што для недзяржаўных народаў Цэнтральнай і Усходняй Еўропы, да якіх адносяцца і беларусы, з'яўленне нацый і нацыянальных культур – гэта рэаліі канца XVIII– XX стст. Згодна з Міраславам Грохам, гэты працэс праходзіць у сваім класічным развіцці тры фазы: перыяд навуковай зацікаўленасці этнічнай групай (этнічнымі групамі), з якой фармуецца асобны народ; перыяд агітацыі на карысць дадзенага нацыянальнага руху; перыяд, калі дадзены нацыянальны рух набывае масавы характар [3]. Згодна з гэтай мадэллю Гроха, беларусы ў канцы XIX – пачатку XX ст. перажывалі толькі адначасова як другую, так і трэцюю фазу свайго фарміравання як нацыі. У гэты час артыкулюецца беларуская нацыянальная ідэя, якая паступова заваёўвае прыхільнікаў. Дзякуючы гэтаму нацыянальны рух пашыраецца, а беларускае адраджэнне пачынае ўваходзіць у фазу свайго найбольшага развіцця.

Пры гэтым пачынае назірацца пэўны дысананс, выкліканы тым, што беларусы ў асобах сваіх палітычных дзеячаў ад самага пачатку пазіцыянавалі сябе як сялянскую нацыю. Між тым сучасная мадэрная нацыя менавіта ўзнікае як прадукт працэсу ўрбанізацыі. Разам з гэтым назіралася і яшчэ адна супярэчнасць – перанасяленне беларускага вясковага насельніцтва ў гарады не толькі спрыяла кансалідацыі беларускай нацыі, але часам мела і адваротную тэндэнцыю, якая праяўлялася ў размыванні беларускай этнічнасці, што было выклікана не беларускім характарам гарадской культуры ў гарадах Беларусі.

Таму, не ўступаючы ў палеміку аб якасных складальніках урбанізацыйных працэсаў на Беларусі, засяродзімся ў першую чаргу на іх колькасных паказчыках. Тут мы падыходзім

да самай складанай часткі, аналізу працэсу ўтварэння беларускай нацыі – урбанізацыі, паколькі нам неабходна вызначыцца, якія паказчыкі можна лічыць як базавыя.

Такі вядомы сацыёлаг і географ, як Д. Джобс, сцвярджае, што пераходам краіны да стану гарадской цывілізацыі ці ўтварэннем новага «мадэрнага» грамадства можна лічыць дасягненне 20% гарадскога насельніцтва, ён вызначае ўзровень у 20–40% як другую яго стадыю, г. зн. як пераход да мадэрнізаванага індустрыяльнага грамадства. Узровень у 40–60% вызначаецца ўжо як высокі.

Што тычыцца непасрэдна Беларусі, то тут тэмпы росту гарадскога насельніцтва ў першай палове XX ст. выглядаюць так – 1897 г. – 13%, 1926 – 17; 1939 – 20,8; 1959 – 30,5; 1970 – 43,3; 1979 – 54,9; 1989 – 69,3% [4], пры гэтым рост дасягаўся пераважна за кошт сельскіх жыхароў, асабліва імкліва павялічвалі сваё насельніцтва буйныя гарады. Як бачна з прыведзеных лічбаў, Беларусь увайшла ў першую стадыю мадэрнізаванага ці індустрыяльнага грамадства напрыканцы 30-х гг. XX ст. і знаходзілася ў ёй да другой паловы 60-х гг. XX ст. Пасля чаго распачаўся этап «другой індустрыялізацыі» БССР, які лагічна супаў з паступовым уваходжаннем беларускай нацыі ў стадыю звышурбанізацыі, якая цягнецца і да сённяшняга моманту. Больш таго, па ўзроўні ўрбанізацыі беларусы зараз знаходзяцца на першым месцы сярод краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы і СНД.

Але, вяртаючыся да разглядаемай тэмы, трэба адзначыць, што ў першай палове XX ст. гэты працэс адбываўся даволі павольна. У гэтай сувязі цікавым будзе параўнанне міравога і рэгіянальнага трэндаў у развіцці працэсу ўрбанізацыі. Так, для свету вызначаецца наступная дынаміка 1850 г. – 6,4%; 1900 г. – 13,6; 1950 г. – 28,2% [5].

Што тычыцца рэгіёна, то тут у якасці ўзору можна ўзяць Украіну, Польшчу і Расію як найбольш блізкія сярод сацыякультурнага асяродка. Так, для Польшчы гэтыя даныя будуць наступныя: 1900 г. – 17,8; 1921 г. – 24,1; 1931 г. – 31,8; 1950 г. – 39% [6]. Для Украіны ў гэтыя ж гады: 1897 г. – 14,3; 1926 – 20; 1930 – 26,2; 1939 – 33,5 і 1950 – 35,3%. Што тычыцца Расіі, то статыстыка тут выглядае наступным чынам: 1897 г. – 15; 1926 – 18; 1939 – 33; 1950 – 45% [7, с. 103]. Відавочна, што ў параўнанні з суседзямі рост гарадскога насельніцтва адбываўся са спазненнем прыкладна на дзесяцігоддзе. Яшчэ больш відавочнай гэта запаволенасць становіцца пры параўнанні з найбольш развітымі краінамі свету. Так, напрыклад, доля гарадскога насельніцтва ў ЗША ў 20–30-я гг. XX ст. узрасла з 51,3 да 56,2%.

**Заключэнне.** Як бачна з прыведзеных лічбаў, хаця Беларусь цалкам адпавядала міраваму трэнду, але ў рэгіянальным працэсе развіцця ўрбанізацыі знаходзілася сярод аўтсайдэраў. Гэтай з'явай таксама можна патлумачыць адносную слабасць беларускага нацыянальнага руху. Такім чынам, што тычыцца методыкі, прапанаванай Дойчам, то ці ў дачыненні да Беларусі яе прымяненне мае абмежаваныя магчымасці, ці неабходна пераасэнсоўваць працэс нацыятварэння на Беларусі, паколькі па паказчыках урбанізацыі Беларусь не адпавядае ўяўленням пра яе неабходны мінімум, аднак факт існавання беларускай нацыі напярэдадні II Сусветнай вайны падаецца нам бясспрэчным. Магчыма, вырашэнне дадзенага пытання ляжыць у больш глыбокім аналізе канкрэтна-гістарычных умоў, у якіх апынулася беларуская нацыя ў 20–30-я гг. XX ст., існаванні яе ў падзеленым стане і даволі высокай ступені напружанасці ў адносінах паміж СССР і Польшчай. Акрамя гэтага, трэба адзначыць, што ў Беларусі, паколькі яна адносілася да рэгіёна «другаснай мадэрнізацыі», урбанізацыя адбывалася не па класічнай мадэлі.

## Літаратура


1. Геллнер, Э. Нации и национализм / Э. Геллнер. – М.: Прогресс, 1991. – 320 с.
2. Бродель, Ф. Динамика капитализма / Ф. Бродель. – Смоленск: Полиграмма, 1993. – 124 с.
3. Hroch, M. Evropska narodni bnuti v 19 stoleti. Spolecenske predpokladu vzniku novodobycy nrodu / M. Hroch. – Praga: Svoboda, 1986.
4. Гісторыя Беларусі: у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2006. – Т. 5: Беларусь у 1917–1945 гг. / М. Касцюк [і інш.]. – 2006. – 613 с.
5. Урбанизация в формировании социокультурного пространства / под ред. Э. В. Сайко. – М.: Наука, 1999. – 285 с.
6. Развитие городов. Польша.ру. – Режим доступа: http://www.polska.ru/ polska/geografia/demografia.html. – Дата доступа: 25.03.2011.
7. Пивоваров, Ю. Л. Урбанизация России в XX веке: представления и реальность / Ю. Л. Пивоваров // Общественные науки и современность. – 2001. – № 6. – С. 101–113.


*Пастyпіла 30.03.2011*